***П. Р. Ігнатовіч,***
*кандыдат гістарычных навук, прафесар,*
*прафесар кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# ІНБЕЛКУЛЬТ У РАЗВІЦЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ НАВУКІ І КУЛЬТУРЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для нашай краіны 2019 г. знамянальны значнымі гістарычнымі падзеямі. Засяродзім увагу на двух – стогадовым юбілеі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (01.01.1919 г. апублікаваны маніфест, які абʼявіў аб стварэнні БССР) і 90-годдзем Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

З набыццём незалежнасці (хоць і пэўным чынам абмежаванай) наша дзяржава атрымала магчымасць уласнага развіцця, беларускага адраджэння ў новых умовах.

Дзяржаўнае будаўніцтва праходзіла ў вельмі складаных умовах. Акрамя цяжкага эканамічнага становішча было страчана шмат таленавітых навуковых кадраў, у тым ліку і сярод інтэлігенцыі ў гады Першай сусветнай і Грамадзянскай войнаў, а таксама эміграцыі.

Адной з важнейшых задач і формаў праяўлення суверэнітэту стала стварэнне ў Рэспубліцы нацыянальных цэнтраў духоўнага развіцця. Літаральна з першых крокаў пачынаецца актыўная дзейнасць дзяржаўнай улады па ўзнаўленні адукацыі, нацыянальнага тэатра, літаратуры і мастацтва. Вельмі важным звяном было стварэнне ў рэспубліцы вышэйшай школы, таму ў красавіку 1919 г. аднаўляе сваю дзейнасць Горацкі сельскагаспадарчы інстытут (быў закрыты ў 1863 г.), у 1921 г. у Мінску пачынае працаваць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Паступова ствараецца база для далейшага росту навуковага патэнцыялу рэспублікі.

Беларускае нацыянальнае адраджэнне ў 20-х гг. вылілася ў палітыку беларусізацыі, якая была зʼявай шматбаковай, ахоплівала асвету, навуку, культуру, друк, справаводства, іншыя галіны дзейнасці грамадства і ажыццяўлялася партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам пры шырокай падтрымцы працоўных мас і актыўным удзеле навуковай і творчай інтэлігенцыі.

Задачы будаўніцтва новага грамадства патрабавалі глыбокіх сістэматычных навуковых даследаванняў. Адным з першых крокаў у гэтым напрамку стала стварэнне ў лютым 1921 г. навукова-тэрміналагічнай камісіі пры Наркамаце асветы БССР, асноўнай задачай якой была распрацоўка беларускай навуковай тэрміналогіі. На працягу 1921 г. камісія выпрацавала каля 2,5 тысяч тэрмінаў для гуманітарных, прыродазнаўчых і матэматычных навук. Новым крокам у станаўленні беларускай навукі і культуры стала адкрыццё на базе навукова-тэрміналагічнай камісіі Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта). Каля вытокаў Інстытута і ў час яго дзейнасці былі выдатныя дзеячы беларускай культуры і навукі: народныя пісьменнікі І. Д. Луцэвіч (Я. Купала), К. М. Міцкевіч (Я. Колас), пісьменнікі М. І. Гарэцкі, З. Ф. Жылуновіч (Ц. Гартны), гісторыкі У. М. Ігнатоўскі, У. І. Пічэта, мовазнаўцы П. А. Бузук, Я. Лёсік, С. М. Некрашэвіч, літаратуразнаўцы І. І. Замоцін, М. Піятуховіч, фалькларысты і этнографы І. А. Сербаў, А. А. Шлюбскі, мастацтвазнаўцы Я. Л. Дыла, М. М. Шчакаціхін, юрысты М. Гуткоўскі, Р. Я. Парэчын, геолаг М. Ф. Бліадухо, заолаг А. У. Фядзюшын, батанік Ц. М. Годнеў, медыкі А. К. Ленц і І. Т. Цітоў, геолагі, географы-эканамісты Г. І. Гарэцкі, А. А. Смоліч, глебазнавец Я. М. Афанасьеў і інш. [3, с. 5].

Першы агульны сход супрацоўнікаў Інстытута беларускай культуры адбыўся 30 студзеня 1922 г. З гэтай даты і пачалася практычная дзейнасць Інбелкульта. У яго склад увайшлі старшыня С. М. Некрашэвіч, вучоны сакратар У. У. Чаржынскі, правадзейныя члены Я. Ф. Карскі (жыў у Петраградзе), І. Д. Луцэвіч (Я. Купала), К. М. Міцкевіч (Я. Колас), Я. Лёсік, навуковыя супрацоўнікі М. М. Гуткоўскі, С. М. Бурак, А. П. Круталевіч, М. М. Піятуховіч, С. Я. Плаўнік (Змітрок Бядуля) і інш. [3, с. 9].

На працягу параўнальна невялікага перыяду дзейнасці з 1922 па 1928 гг. Інбелкульт перажыў некалькі рэарганізацый, якія абумоўліваліся задачамі сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і нацыянальнага развіцця рэспублікі. Мэтай рэарганізацый быў больш актыўны ўдзел інстытута ў вырашэнні гэтых задач.

Распачаўшы сваю дзейнасць з даследаванняў у галіне гуманітарных навук, Інбелкульт паступова распрацоўвае і іншыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

напрамкі. Ужо з 1924 г. з'яўляюцца навуковыя падраздзяленні прыродазнаўчага профілю: геаграфічная, медыцынская, аграномічная секцыі. Інстытут пачынае набываць характар комплекснай навуковай установы, у якой канцэнтравалася развіцце асноўных галін навукі і культуры. Інбелкульт змог забяспечыць навуковую распрацоўку праблем гаспадарчага і культурнага будаўніцтва Савецкай Беларусі, і паступова стаў пераўтварацца ў вядучы навуковы цэнтр [1].

Задачы Інбелкульта значна пашырыліся ў 1924 і 1926 гг., у сувязі з далучэннем да Беларускай ССР зямель на ўсходзе. Тэрыторыя рэспублікі павялічылася амаль у два з паловай разы, а колькасць насельніцтва ўзрасла больш чым у тры разы. Гэта істотна павялічыла маштабы працы, з'явілася сур'ёзным падмацаваннем у справе падрыхтоўкі навуковых кадраў [2].

Інстытут беларускай культуры ствараўся як установа, якая павінна была садзейнічаць культурнаму развіццю БССР, але паступова інстытут перайшоў да навуковых распрацовак у іншых напрамках, якія ахоплівалі як грамадазнаўчыя навукі, так і навукі аб прыродзе. У галіне гуманітарных навук працавалі секцыі і камісіі па складанні слоўніка жывой беларускай мовы, дыялектычная, бібліяграфічная, літаратурна-мастацкая, культурна-гістарычная і інш. У 1924 арганізаваны секцыі этнаграфіі і геаграфіі, мастацтва, права, педагогікі, медыка-ветэрынарная, сацыяльна-эканамічная.

У складзе Інбелкульта была вялікая колькасць секцый, камісій, аддзелаў, іншых падраздзяленняў, якія сталі базай для стварэння асобных інстытутаў. У 1924 г. ЦВК і Савет Народных Камісараў БССР зацвердзілі «Палажэнне аб Інстытуце беларускай культуры», паводле якога ІБК прызнаваўся вышэйшай дзяржаўнай навуковай установай Беларусі. У 1925 г. былі арганізаваны яўрэйскі і польскі аддзелы, у 1927 г. – літоўская і латышская кафедры. На 01.07.1926 у інстытуце працавалі 77 правадзейных членаў, 69 членаў-супрацоўнікаў і 60 членаў-карэспандэнтаў. У дзейнасці яго ўстаноў удзельнічалі каля 200 супрацоўнікаў ВНУ. У 1927 г. Савет Народных Камісараў БССР зацвердзіў новы статут ІБК [2].

З моманту арганізацыі Інбелкульта да студзеня 1925 г. старшынёй з'яўляўся вядомы навуковец С. М. Некрашэвіч. Са студзеня 1925 г. на чале Інбелкульта стаў наркам асветы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У. М. Ігнатоўскі. У лютым 1926 г. ЦВК БССР прыняў рашэнне выдзеліць Інбелкульт са складу Наркамата асветы, пераўтварыўшы яго ў самастойную ўстанову, падпарадкаваную непасрэдна СНК БССР. Гэтай жа пастановай старшыня прэзідыўма Інбелкульта У. М. Ігнатоўскі па яго просьбе быў вызвалены ад пасады народнага камісара асветы і засярэдзіў усю ўвагу на рабоце ў Інбелкульце [3, с. 17].

У. М. Ігнатоўскі і на пасадзе наркома асветы і на пасадзе кіраўніка ІБК прыкладаў вялікія намаганні, каб аб'яднаць для плённай навуковай працы ў Інбелкульце і вышэйшых навучальных установах розных па палітычных поглядах людзей, у тым ліку і тых, хто вярнуўся ў сярэдзіне 1920-х гг. з эміграцыі. Сярод іх былі і актыўныя дзеячы Рады Беларускай Народнай Рэспублікі В. У. Ластоўскі, А. І. Цвікевіч, А. А. Смоліч і інш. Многія высокакваліфікаваныя вучоныя, у тым ліку з так званай старой прафесуры, прыехалі з РСФСР, Украіны і іншых месцаў [3, с. 24].

ІБК падтрымліваў сувязь з савецкімі і замежнымі даследчымі навуковымі ўстановамі. У 1928 г. у ім працавалі 115 штатных супрацоўнікаў. ІБК адыграў значную ролю ў правядзенні палітыкі беларусізацыі, зрабіў плённы ўплыў на розныя бакі навуковага і культурнага жыцця рэспублікі. 13.10.1928 г. пастановай ЦВК і СНК БССР Інбелкульт рэарганізаваны ў Акадэмію навук Беларусі, урачыстае адкрыццё якой адбылося 01.01.1929 г. Першым прэзідэнтам Акадэміі быў абраны акадэмік У. Ігнатоўскі.

З першых дзён існавання Акадэмія стала вядучым навуковым даследчым цэнтрам Беларусі, які аб'яднаў лепшых навукоўцаў краіны. Прайшоўшы вялікі творчы шлях, акадэмія ўнесла важны ўклад у развіццё народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі, а па некаторых кірунках – і сусветнай навукі. За гісторыю існавання ў НАН Беларусі сфарміраваліся аўтарытэтныя навуковыя школы, якія маюць міжнароднае прызнанне.

Сёння НАН Беларусі – буйны еўрапейскі навуковы цэнтр з багатымі і моцнымі міжнароднымі сувязямі, які аказвае вялікі ўплыў на інавацыйнае развіццё краіны і аб'ядноўвае 115 арганізацый, з'яўляючыся магутнай навукова-вытворчай карпарацыяй. Акадэмія актыўна задзейнічана ў рэалізацыі буйных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

комплексных праграм агульнадзяржаўнага маштабу, сярод якіх запуск першага беларускага спадарожніка Зямлі і стварэнне сістэмы геаінфармацыйнага зандзіравання, будаўніцтва першай беларускай АЭС, асваенне мінеральна-сыравіннай базы краіны, вытворчасць фармсубстанцый, стварэнне перадавой сістэмы сельскагаспадарчых машын, вытворчасць шырокага спектру прадуктаў нафтахіміі і інш.

Галоўным рэсурсам, капіталам НАН Беларусі з'яўляюцца людзі. Гэта каля 16 тысяч супрацоўнікаў, з якіх каля 8 тысяч займаюцца навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі. Тут працуе 126 членаў-карэспандэнтаў і 84 акадэміка, звыш 400 дактароў і больш за 1700 кандыдатаў навук. Штогод у Акадэмію навук прыходзіць ад 300 да 350 маладых навукоўцаў.

Актыўна развіваецца міжнароднае супрацоўніцтва. Падпісаныя дагаворы і пагадненні аб супрацоўніцтве з акадэміямі навук і навуковымі цэнтрамі амаль з 90 краін свету.

---


1. *Грамовіч, У. У.* Інстытут беларускай культуры / У. У. Грамовіч, У. М. Міхнюк, І. У. Саламевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск. – Том 7. – С. 266.

2. Інстытут беларускай культуры // Культура Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск, 2013. – Т. 4. – С. 198.

3. Інстытут беларускай культуры / М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 255 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


***Д. А. Кожемяко,***
*кандидат искусствоведения,*
*старший преподаватель кафедры режиссуры*
*Белорусского государственного университета*
*культуры и искусств*


# МНОГООБРАЗИЕ ЖАНРОВ ХОРЕОГРАФИЧЕСКОГО ИСКУССТВА В ТЕЛЕВИЗИОННЫХ ТАНЦЕВАЛЬНЫХ ПРОЕКТАХ

На сегодняшний день экранная культура изобилует хореографическими артефактами, а количество танцевальных телевизионных конкурсов увеличивается едва ли не в геометрической прогрессии. Но такая тенденция наметилась недавно – только с начала XXI в. мировое коммуникативное простран-